Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

РЭХА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 3 — Вільня, Субота 8-га верасьня 1928 г. — Год 1

Да парадку дня.

З часу ліквідацыі Грамады буйны размах сьвядомага жыцьця беларускіх працоўных гушчаў нібы затамаваўся. Па крайняй меры так выглядала навонак. Запраўды — ён ня спыніўся і гэта кожны ведае, хто хоць трошкі знаёмы з абставінамі нашага жыцьця. Жыцьцёвая сіла народу, будучы падобна быстрай рэчцы, якая затамавана штучна ў сваім бегу, пачала зьбірацца ў стаў, каб у патрэбны мамэнт быць выкарыстанай з большай прадуктыўнасьцяй. Ад вялікага пажару асталося й немалое вогнішча, якое, пакрыўшыся зьверху попелам, унутры гарэла тым самым палючым вагнём, які грэў з няменшаю сілаю, як раней, чакаючы толькі суадказнага матар'ялу, каб ня толькі грэць, а й асьвятляць. Кінэтычная (руховая) энэргія перарабілася ў потэнцыяльную (скрытую), гатовая ў кожную мінуту пераменіць свой стан.

Праўда, да такое зьмены, да такога відавочнага зацішша прымушалі вонкавыя абставіны, але так ці інакш, зацішша было. Тлела наша культурная пляцоўка — Т-ва Бел. Школы, тлелі, здавалася, іншыя рухавікі. Толькі „успырскі“ чыста вонкавага характару, як выбары ў самаўрады, нарэшце выбары ў Сойм, выводзілі на час сілу народу з потэнцыянальнага палажэньня ў кінэтычнае, але ўсё-ж на час. Як пад'емны гул, праносіліся паміж працоўных чуткі аб „непаразуменьнях“ у кіраўніцтве, аб „шуканьні іншых дарог“, чуць не аб зьмене фронту. Высьпелы грамадзкі народ маўчаў і чакаў указаньняў выхаду з палажэньня, верачы ў цэнтр. Магчыма, што інакш і не магло стацца, рух ішоў, падпарадкуючыся пэўным законам. Але нічога вечным ня бывае — прысак таксама тлее і таксама потэнцыянальная энэргія народу прытуплялася. Пачуліся шмат адкуль словы зьняверра ў свае сілы, слабейшыя адзінкі адыходзілі, „здраджалі“, запоўнілі сабой розныя — „kółki rolnicze“, „kółki młodzieży“ і т. п. Патрэбен быў новы „успырск“.

Вось якраз гэтым „успырскам“ і зьявіўся факт прыкрыцьця Галоўнай Управы з перапалоханьнем шмат якіх „генералаў“, гатовых пайсьці з павіннай. Каб гэта сталася запраўды — нашаму працоўнаму руху грэзіла-б чуць ня сьмерць.

Але жыў народны дух! З усіх бакоў правінцыі з годнай увагі шпаркасьцю прыкаціўся голас адпору, пратэсту, мала таго, сьвежы голас ажыўленьня. Потэнцыянальная энэргія, відавочна, пераходзіць зноў у кінэтычную. *Цяпер — можна сьмела сказаць—адзіны і суцэльны беларускі народ, пакінуўшы, як угадоўцаў гэтак і здраднікаў—хоча жыць, гарэць, тварыць.* Зацішша скончылася!

Шмат ёсьць магчымасьцяў праяўленьня ўзбуджанай энэргіі, столькі магчымасьцяў, сколькі ёсьць старонак вонкавага грамадзкага жыцьця—палітычная, эканамічная, культурная, спорт, самаўрады і г. д. і г. д. Народная энэргія шукае ўсюды выхаду.

Не распыльвацца! Дзьве важнейшыя задачы, на якія мы павінны скіраваць цяпер усю ўвагу. Першая—*родная школа.* Ня гледзячы на выданыя законы, ня гледзячы на яўна выражаную волю беларускіх сялян і работнікаў—*сваей школы мы ня маем.* За нас ужо хочуць рабіць бэбэхі (адзінка), дакляруюць нам, хочуць палашчыць, „ашчасьлівіць“ (няхай іх ласку прыймаюць „Зьвязы“!). Што такое? Паны нам хочуць даць? Байкі—*дадуць толькі на нашае ўпартае дамаганьне!* У адказ на кіданьне костак у наш бок—адкажам цяпер дружнай пададай дэкляацыяў. Калі дакляруюць—няхай даюць, няхай даюць толькі, сколькі нам трэба, каб супакоіць наш духоўны голад. Словам, мы паверым тады, калі будзем нешта мець, бо тая жменька беларускіх школ, якую нам кінулі паны летась—насьмешка над намі. Там вучаць „галілеюшы“, туды беларускіх вучыцялёў, якія гніюць па вёсках без работы, ня пускаюць—брак кваліфікацыяў (у той час зусім бязграматныя людзі, накшталт „вучыцеля“ В. Нікінорчыка, робяцца „прафэсарамі“ вучыцельскай сэмінарыі—ў Шчучыне). Мы маем права, *законнае права*, трэбаваць свае роднае школы. Нам гэта права дае канстытуцыя, як таксама іншыя дзяржаўныя забавязаньні. Але мы дастанем, зрэалізуем яго толькі *праз барацьбу за школу.* Пабачым, як дабрадзеі — бэбэхі адклікнуцца на гэта! Дык да барацьбы за школу! Няхай ня будзе першых ні апошніх. Не аставацца ззаду нікому. Вось *першая і найважнейшая наша задача.*

Другая—каапэратывы. Сколькі мы пераплачваем гандляром?! А гэта пераплата магла-б астацца ў нас, у вёсцы, пашла-б, хоць ня відочна, але ўсё-ж пашла-б на палепшаньне нашага быту. Не забывайма́ся, што каапэратары лічаць свае пляцоўкі адзіным шляхам пераходу да жыцьця на новых падвалінах! Маем сумную практыку мы і з каапэратывамі. „Разумныя галоўкі“ рашылі, што карысьней (для каго?!) зьліквідаваць беларускія пляцоўкі каапэрацыі, — і мы іх цяпер ня маем. Але час, час да працы. Арганізуйма каапэрацыю на тых падставах, на якіх яна існуе цяпер. *Яна будзе служыць нам!*

Да працы!

НАВАКОЛ КІТАЮ.

Манархічнае „Słowo“ не баіцца часам сказаць праўды аб міжнародавым палажэньні, бо гэта ад іх далёка. У апошніх нумарох мы бачым ацэнку палажэньня ў Кітаі. Кітай цяпер — адно з вогнішчаў сусьветнай палітыкі. Паскольні народныя гушчы цікавяцца ім — прыгледзімся мы да гэтае сітуацыі.

Працяжная ўнутраная вайна ў Кітаі закончылася ўрэшце поўнай перамогай Паўдзённай арміі над Паўночнай, а значыць і новай, нацыяналістычнай кітайскай ідэалёгіі над старай, спаўшай глыбокім сном нясьведамасьці і, галоўнае, пасыўнасьці ідэалёгіі. Разам з падзеньнем старой ідэалёгіі пала і яе сядзіба, сталіца — Пэкін, уступіўшы месца новай сталіцы новага Кітаю—Нанкіну.

У Нанкіне цяпер месьціцца вярхоўная ўлада Куо-Мін-Танг, вялікай кітайскай партыі, якая ўжо выдае загады на ўвесь Кітай. З Нанкіну йдзе працэс далейшага аб'яднаньня Кітаю, пад лёзунгам нацыянальнага вызваленьня з-пад ярма чужаземцаў і некаторых сацыяльных рэформаў. Такая рашучая палітыка нанкінскага ўраду, выступаючага яўна і вонках Кітаю за яго поўную незалежнасьць, зьяўляецца цэмэнтам, спайваючым кітайскія правінцыі і кітайскія народныя масы. Па працяжнай хатняй вайне, бачым, што фармуецца новы Кітай, сьвядомы сваей магутнасьці і поўны пачуцьця нацыянальнай вартасьці.

Апіраючыся на гэтай народнай сьведамасьці, новы кітайскі ўрад пачаў зрываць старыя ўмовы (папярэдняга ўраду) з чужаземнымі дзяржавамі, даючыя апошнім спэцыяльныя і далёкасягаючыя прывілеі на абшарах Кітаю.

Так, Кітай ўжо прызнаў за няважную ўмову папярэдняга ўраду з Японіяй, якая была вельмі карыснай апошняй.

Як жа да гэтага адносіцца Японія? Што маюць значыць яе фармальныя збройныя варты на кітайскае „сухазем'е“ (матэрык), яе зусім заборчыя ня толькі пляны, але і дзеі, то розныя „ўступкі“, з мэтаю зьбліжэньня да Кітаю, выгрываньнем на „расавым брацтве“, навет яўным стараньнем, як найбольш мірнага „сужыцьця“ з магутным суседам — Кітаем?

Каб ведаць, як адносіцца да гэтага Японія, паглядзім, у якім яна знаходзіцца становішчы і што для яе значыць гэты адказ.

Як ведама, Японія амаль не катастрафальна пералюднена.

Палова насельніцтва займаецца земляробствам на дробных кавалачках зямлі, выкарыстаных ўжо да апошняй магчымасьці. Кожная пядзя выспы занята, калі не пад ральлю, то пад прамысел, або будынак. Гушчыня на выспах страшэнная. Японскія выспы падобны да кіпучай стравы у залютаваным (запаеным) гэрмэтычна начэньні, бо аб эміграцыі ня можа быць і мовы. Аўстралія і іншыя англійскія калёніі, з адпаведным для японцаў кліматам, ня прыймаюць наагул ніякіх эмігрантаў, а амэрыканскія забароны прыйманьня эмігрантаў скіраваны процi жоўтай масы. А эміграваць у Амэрыку жоўтая раса, перадусім японцы, вельмі хацелі-б, дый ёсьць чаго.

На другім боку акіяну, у вельмі ўраджайнай Каліфорніі, з так адпаведным для японцаў кліматам, на абшарах 410.000 квадр. кілямэтраў, жыве ледзь паўтара мільёна жыхароў і ўсе яны проста купаюцца ў дастатку і багацтве. А побач, у Японіі, на абшарах 740.000 квадр. кілямэтраў (навет не ўдвая большых) жыве аж 80.000.000 жыхароў, якім няма як сяк-так пражывіцца!

І да гэтай Абяцанай Зямлі немагчыма дабрацца — дзьверы яе для японскай эміграцыі шчыльна зачынены.

Калі толькі магло здавацца, што Мэксыка, пасвараная з Злучанымі Штатамі, войдзе ў якое больш менш зьбліжэньне з Японіяй і гэтым будзе змушана адчыніць дзьверы японскай эміграцыі, дык вашынгтонскі ўрад загразіў мэксыканскаму ўраду вайной і акупацыяй усей Мэксыкі, калі яна паважыцца зламаць агульна амэрыканскую падставу: „Амэрыка для Амэрыканцаў“.

Потым былі чуткі, што Злучаныя Штаты маглі-б уступіць Японіі Філіпіны (выспы), але і гэта не магло быць, бо японец ня зносіць зваротнікавага (тропічнага) клімату. Гэты клімат для яго забойчы.

Далёкая і халодная Сібір ня цягне японца, хоць-бы ён і паміраў з голаду на сваім высасаным да апошняга кавалачку зямлі.

Праўды, была здабыта Карэя, але хутка і яна, як сама Японія, зрабілася аднолькава пералюдненай. Воляй-няволяй Японіі прышлось разьвітацца з думкай помачы сваей страшнай хваробе—пералюдненьню—шляхам эміграцыі, бо эміграваць ня было куды.

Але жывы арганізм змагаецца да апошняга. Японія кінулася да вялізарнага ўпрамысла́веньня краю. Выдала на гэта вялікія кошты і высілкі, — і што ж аказалася? Аказалася, што і гэтая, апошняя засоба далёка ня можа ўратаваць Японію ад паграджаючага голаду. Аказалася, што ў Японіі не хапае сыр'я, без чаго ня можа йсьці задаваляюча індустрыяцыя (прамысловасьць), гэта адно, а другое, гэта вельмі малы рынак збыту разьвітага да максімума японскага промыслу.

Гэтыя прычыны і змусілі Японію шукаць і таго і другога: і сыр'я і адпаведнага рынку збыту і навет тэрыторыі для эміграцыі. А пад бокам ляжыць, здаецца, спаўшы, і бяссільны сусед—Кітай. Асабліва для Японіі зьяўляліся адпаведнымі дзьве вялізныя правінцыі Кітаю: Манджурыя і Манголія. Манджурыя з яе багатымі залежамі вугля і жалеза і бесканечнымі абшарамі, так прыгоднымі для розных плянтацыяў, а Манголія з яе ўраджайным грунтам, так надаючымся да японскай калёнізацыі. Але вось „новы курс“ у Кітаі, новы ўрад радыкальна зрывае з старымі канцэсіямі, з тымі канцэсіямі, якія мела на гэтыя правінцыі Японія і якія мелі на іншыя правінцыі і іншыя замежныя дзяржавы. Што-ж тут рабіць Японіі, — пэўна трэба ўтрымаць іх сілай зброі?

З аднаго боку — так. А з другога—зусім інакш.

Разьвіцьцё прамысловасьці патрабуе міру і спакою, сталых падставаў крэдыту і даверра.

Сярод ваеннай буры, пад гукі гарматаў і ў душачых газах ня можна правясьці ніякага разьвіцьця промыслу ані ў сябе дома ў Японіі і, ані ў забранай сілай аружжа Манджурыі і Манголіі.

Далей, Японіі ўсьцяж паграджае магчымасьць уплываў на Кітай СССР, хоць-бы ў Кітаі быў і як найбольш нацыяналістычны ўрад. А што значаць уплывы СССР у Кітаі — добра ведама гэта ўсяму сьвету, ды толькі ўплывам СССР цяперашні Кітай і абавязаны сваім нацыянальным вызваленьнем, хаця гэтыя ўплывы кіравалі кітайскую рэвалюцыю на яшчэ большыя здабыткі — і на сацыяльнае вызваленьне Кітаю.

І яшчэ адно важнае зьявішча — японскую прамысловасьць стала байкатуюць кітайцы, хоць і ня яўна, а скрытна, а з другога боку — пагроза камуністычнага перавароту ў Японіі.

Гэта і ёсьць галоўныя прычыны пераходу ваяўнічай Японіі раз-па-раз да ўсё-больш мірнай палітыкі ў адносінах да Кітаю. Аб ёй можна цяпер сказаць так: шаг упярад з „паднятым мячом“ і разам шаг назад, запэўняючы Кітай аб найпрыязьнейшых пачуцьцях. Гэта падвойная гульня, вярней нерашучая гульня, з мэтай „вывесьці ў поле“, як палітыкаў Эўропы, так і Амэрыкі. Гэта толькі проба Японіі даць сабе рады з Кітаем, як не дабром дык злом, як ня злом, дык дабром.

Але тактыка японскай палітыкі астаецца тая самая. Японскія капіталісты, так ці іначай, прапануюць Кітаю адно: эксплёатаваць прыродныя багацьці Кітаю і перарабляць у тавары, для таго-ж самага Кітаю, чым будуць эксплёатаваць і шырокія, спажываючыя іх, пераважна працоўныя кітайскія масы. Але малады, распусьціўшы нядаўна крыльля кітайскі капіталізм ня хоча згадзіцца на гэтыя „братнія“ варункі, ён сам беспасярэдна хоча эксплёатаваць свае многамільённыя працоўныя масы. Кітайскі капіталізм, вырасшы на крыві, касьцях нядаўнейся рэвалюцыі працоўнага Кітаю спадзяецца на ўласныя сілы і ўласны спрыт эксплёатацыі гэтых амаль паўмільярдавых масаў! І дзеля гэтага, — як выразіўся нядаўна адзін нанкінскі карэспандэнт—гэтая працягнутая да Кітаю японская рука вельмі часта, раз за разам, сьціскаецца ў азброены кулак. Японскі капіталізм вядзе гульню з кітайскім. Ідзе гульня аб фактычным існаваньні японскага капіталізму, які, апрача Далёкага Усходу, ня можа шукаць нідзе ратунку. Толькі ў Кітаі японскі капіталізм мог бы пазбыцца свайго надмеру жыхарства і толькі пры помачы эксплёатацыі вялізнага Кітаю мог-бы разьвівацца японскі капіталізм.

Але на дарозе да гэтага японскаму капіталізму стаіць, ня толькі кітайскі капіталізм і ўплывы на Кітай адзінай у сьвеце дзяржавы працоўных—СССР, але і магутны „брат“ — вораг японскага капіталізму, яго сталы і небясьпечны канкурэнт—амэрыканскі капіталізм, капіталізм Злуч. Штатаў, якім таксама няма куды дзяваць сваіх тавараў, якія таксама ні за-што ня хочуць упусьціць з сваіх эксплёататарскіх рук амаль ня паўмільярда працоўных Кітаю. І вось Амэрыка (Злуч. Штаты) стараецца ўсімі спосабамі адцягнуць новы кітайскі ўрад ад Японіі, так сказаць, ганяецца за яго сымпатыямі выключна да сябе. І з гэтай мэтай Зл. Штаты першыя прызналі ўрад у Нанкіне і навет даюць яму пазычку. Якога ж яшчэ ражна тут трэба, каб ня бачыць, куды гэта хіліцца, ведаючы, што канкуруючыя за „рынкі“ капіталісты не шкадуюць „купляць“ іх за мільёны жыцьця і калецтва працоўных, як гэта было ў нядаўна прайшоўшай у нас вайне?

З гэтага мы бачым, якія грозныя хмары чым далей, тым гусьцей, зьбіраюцца на Далёкім Усходзе, на які зьвяртаюцца ўвагі ўсяго сьвету.

Мы бачым, што з-за таго, каму эксплёатаваць кітайскія масы: кітайскаму, японскаму і амэрыканскаму капіталізму—рана ці позна пальюцца рэкі працоўнай крыві, якая ў канцы-канцоў выльецца не ў перамогу адной з „ваюючых“ групаў капіталістаў, а ў перамогу працоўных.

І на гэты выбух на Далёкім Усходзе, адцягнуўшы на сябе ўвагу ўсяго сьвету, ад рэзультатаў якога залежыць далейшы лёс—зямлі, ня прыдзецца хіба-ж доўга чакаць, пакрайняй меры так кажуць усе даныя: ўвесь ход гісторыі.

ЛІГА НАЦЫЯЎ.

Агульны Збор Лігі.

3-га верасьня мела адчыніцца 9-тая сэсія Агульнага Збору Лігі Нацыяў. Агульны Збор Лігі выслухае даклады справаздачы Рады Лігі і паасобных Камісіяў Лігі. Пасьля мае адчыніцца агульная дыскусія, у якой голас будуць мець пачарзе ўсе дэлегацыі, якія будуць мець пры гэтым магчымасьць выразіць жаданьні сваіх краёў і крытычныя пагляды на працу Рады і Камісіяў Лігі.

Пасьля зачыненьня агульнай дыскусіі маюць адбыцца выбары трох сяброў Рады — на мейсца скончыўшых свае паўнамоцтвы старых. Згары ўжо ведама, што адно з мейсцаў у Радзе ўжо забясьпечана Гішпаніі, якая ўзяла назад свой выхад са складу Лігі. Гішпаніі мае быць забясьпечаны згары і паноўны выбар на наступнае трох-лецьце, ці—так званае „паўсталае мейсца“.

Сэнсацыйная вестка ў справе польска-літоўскага спору ў Лізе Нацыяў.

Нямецкае агенцтва падае сэнсацыйную вестку, бытцам Вальдэмарас ня мае намеру зьвярнуцца да Агульнага Збору Лігі — з просьбай аб вырашэньні польска-літоўскага спору — пасьля адчытаньня справаздачы дакладчыка Рады аб ходзе гэтай справы. Такім чынам польска-літоўскі канфлікт ня мог-бы быць разгледжаны на гэтым Агульным Зборы Лігі. Бо-ж для такога разгляду патрэбна згода абедзьвюх спорючых старон, прынамсі тады, калі канфлікт не пагражае выбухам вайны. А дзеля таго, што Польшча і Літва надпісалі трактат Кэллёга, выключаючы тасаваньне вайны ў канфліктах, дык змусіць Літву аддаць на суд Лігі свой спор з Польшчай, здаецца, ня можна.

Афіцыяльнае запярэчэньне сэнсацыйных „заяваў марш. Пілсудскага“.

„ПАТ“ паведамляе, што зьявіўшыся ў расейскай і нямецкай прэсе ў Нямеччыне „вывяд“ з марш. Пілсудскім, які жыве на адпачынку ў Румыніі, цалком выдуманы карэспандэнтам „Руля“. У „гутарцы“ з карэспандэнтам румынскай газэты „Адэвэруль“ марш. Пілсудскі быццам заявіў, што Польшча і Румынія паклікаваны будуць у бліжэйшым часе да цяжкіх баёў — „плячо к плячу“, як саюзьнікі... Дык кожная дзяржава, якая шчыра хоча звольніць сьвет урэшце ад камуністычнай прапаганды, павінна будзе падтрымаць Польшчу і Румынію ў іх барацьбе з заразай камунізму. „ПАТ“ дадае, што крыніцы гэтых „вестак“ расейская манархічная газэта „Руль“ і нямецкая нацыяналістычная прэса зусім ясна высьвятляюць мэту такіх сэнсацыяў...

Скарга віленскіх літоўцаў на польскі ўрад.

„Усх. Агенцтва“ паведамляе, што тымчасовы Літоўскі Камітэт у Вільні выслаў да генэральнага сэкрэтара Лігі Нацыяў Друмонда тэлеграму, у якой даслоўна кажа: „Польскі ўрад у 1927 г. — у парадку палітычнай рэпрэсіі проці літоўцаў зачыніў Віленскую Літоўскую Вучыцельскую Сэмінарыю ў Вільні. У гэтым годзе таксама ня дадзена дазволу на яе адчыненьне. Такім чынам вучні сэмінарыі астаюцца без навукі, літоўскаму грамадзянству не даецца магчымасьці падрыхтаваньня вучыцялёў пачатковых школаў. Літоўскія пачатковыя школы — зачынены як бытцам з прычыны „нявыкваліфікаваных вучыцялёў“... У канцы скарга просіць Сэкрэтарыят Лігі ўзяць пад сваю ахову справу літоўскіх школаў у Польшчы і Таварыства „Рытас“, якое мае мэты выключна культурныя. Скарга падпісана старшынёй Камітэту Сташыцам.

Скандальная „інтэрпэляцыя“ ў Лізе Нацыяў.

Маленькая рэспубліčка Сярэдняй Амэрыкі, якую фактычна ўжо амаль не праглынула магутная Амэрыка, але якая лічыцца сябрам Лігі Нацыяў, зьвярнулася да апошняй з вельмі дражлівай „інтэрпэляцыяй“, ці запытаньнем. Гэтая рэспубліка Костарыка запыталася, як трэба разумець сябру Лігі так званую „доктрыну Монрое“, якая зьяўляецца сталетняй традыцыйнай падставай палітыкі Амэрык. Штатаў і якая кажа, што Амэрыка (Амэрык. Штаты) ня можа дапусьціць ніякага ўмяшацельства Эўропы ў справы амэрыканскіх дзяржаваў („Амэрыка для амэрыканцаў“, як фармулюецца коратка гэты „прынцып Монрое“). Дык—як-жа ж, пытаецца наівіна Костарыка, сумясьціць гэты „прынцып Монрое“ з належаньнем да складу Лігі тэй ці іншай амэрыканскай дзяржавы.—Ліга-ж ня можа ўмешвацца ў амэрыканскія справы,—значыць дзяржавы Амэрыкі — або павінны выйсьці з яе складу, або іх учасьце ў Лізе будзе толькі фікцыйным.—Самі „Злучаныя Штаты“ пасьледавальна не належаць да Лігі, дык у разе якога супярэчнага з іх „падставовым прынцыпам іх палітыкі“ пастанаўленьня Лігі—заявяць пратэст і пэўне-ж здолеюць фактычна скасаваць сілу гэтай пастановы...

Трэба прызнаць, што — і „запытаньне“ само па сябе вельмі дражлівае, дый мамэнт для—інтэрпэляцыі „выбраны асабліва „шчасьлівы“... — Амэрыка трымае ўсе эўрапэйскія дзяржавы на „залатым ланцугу“, з-пад якога толькі-што спрабавалі было вызваліцца толькі Англія з Францыяй, дый то—ня ведама яшчэ, чым скончыцца гэтая спроба... З другога боку сама Амэрыканская Рэспубліка рашуча стала на шлях пляноваага ўмяшацельства у эўрапэйскія, дый сусьветныя справы, нарушаючы гэтым свой уласны „прынцып Монрое“—з другога боку—на падставе ўзаемнасьці...

Рада Лігі, захопленая запытаньнем Костарыкі ўрасплох, не магла аднак-жа адмовіцца ад адказу. І вось пачалі ўсе яе „праўнікі-круцялі“ круціцца, каб даць добры адказ, не сказаўшы нічога па сутнасьці. Бо-ж сказаць няма чаго. Але, як пішуць, такі адказ не задаволіць сяброў Лігі з Сярэдняй і Паўдзённай Амэрыкі, і яны маюць перанесьці крытыку адказу на Агульны Збор Лігі, каб абгаварыць прынцыповую справу па сутнасьці вычэрпваючым спосабам.

Такім чынам кіраўнікі Лігі ня выкруцяцца ад вялізарнага скандалу, пагражаючага масавым выхадам са Складу Лігі ўсіх дзяржаваў Паўдзенйай і Сярэдняй Амэрыкі... Трэба зразумець усю жыцьцёвую важнасьць гэтай прынцыповай справы для гэтых дзяржаваў, якім амаль ня ўсім пагражае праглыненьне з боку Амэрыканскіх Штатаў, якія ўжо трымаюць у фінансавай кабале амаль не цалкам гэтыя дзяржавы. А для Лігі, якая ўсьцяж хоча ўцягнуць Паўночную Амэрыку ў свой склад, гэтае пытаньне таксама пагражае—канфліктам з магутнай Рэспублікай, якога кіраўнікі Лігі пэўне-ж хочуць ухіліцца за ўсялякую цану...

Асаблівую пікантнасьць інтэрпэляцыя Костарыкі мае цяпер таму, што да падпісаньня трактату Кэллёга, які цалком прытрымліваецца „прынцыпу Монрое“, не запрошана ані водная з дзяржаваў Сярэдняй і Паўдзённай Амэрыкі.

Праскочыла толькі адна брытанская „домінія“—Канада. А што гэта значыць, добра ведаюць гэтыя амэрыканскія дзяржавы, выключаныя з „дабрадзействаў трактату“, забараняючага вайну... паміж сябрамі трактату...

Справа Віленшчыны ў Лізе Народаў.

Палітычныя колы у Жэнэве прыпушчаюць, што справа Віленшчыны будзе вырашана ў палове гэтага верасьня, быццам у наступную сераду.

Цікава, каго Ліга накорміць беларускай зямлёй—Літву ці Польшчу, ці мо' нікога з іх?

Нота Радавага ураду у справе далучэньня ССРР да Трактату Кэллёга.

Агенства „ТАС“ падае ноту радавага ўраду, падпісаную Літвінавым і ўручаную француcкаму паслу ў Маскве — Эрбэтту ў адказ на запрашэньне далучыцца да Трактату Кэллёга.

Нота, паміж іншым, кажа. „Ня гледзячы на тое, што галоўная мэта загранічнай палітыкі Радаў ёсьць жаданьне ўхіленьня войнаў і аружных канфліктаў з галіны міжнародавай палітыкі, закладчыкі Парыжскага Трактату ня лічылі патрэбным зьвярнуцца да радавага ўраду, каб ён прыняў учасьце ў перагаворах у часе падрыхтаваньня Трактату, ці ў апрацаваньні яго тэксту“. Далей, крытыкуючы зьмест Трактату, нота кажа: „Перадусім радавы ўрад ня можа ўстрымацца ад выражэньня свайго найвялікшага жалю, што Парыжскі Трактат не зьмяшчае ніякай пастановы аб абавязку разбраеньня“, без чаго ўсялякія добрыя пажаданьні аб скасаваньні назаўсёды вайны ня маюць ніякай рэальнай сілы і значэньня. Далей нота кажа, што самая фармуліроўка найважнейшага I арт., забараняючага вайну, ня мае ніякай точнасьці. Гэта дае магчымасьць вельмі „вольнага тлумачэньня“ ўсяго артыкулу. З свайго боку радавы ўрад кажа, што трэба ясна і выразна забараніць назаўсёды ўсялякія войны, пры тым—ня толькі „як прылад нацыянальнай палітыкі“, але і як спосаб усялякіх іншых рэпрэсіяў проці вызваленчых рухаў паняволеных народаў. Нота трэбуе, каб была ня толькі забаронена вайна ў юрыдычным фармальным сэньсе слова, але і—наагул усялякія ваенныя акцыі фактычна ваеннага характару, як напрыклад, — інтэрвэнцыі, блёкады, акупацыі чужых тэрыторыяў... Гісторыя апошніх гадоў, кажа нота, ведае шмат усялякага роду такіх ваенных спосабаў, якія прычынілі вялізарныя беды народам. Арт. I Трактату кажа аб тым, каб усялякія міжнародавыя споры і канфлікты развязваліся выключна міравымі спосабамі. Дык вось, апіраючыся на гэтым, радавы ўрад цьвердзіць, што да спосабаў яўна не—міравых, яўна забароненых артыкулам Трактату, трэба выразна залічыць такія акты і спосабы, як адмова ўзнаўленьня ці разрыў нармальных дыпляматычных стасункаў між народамі (ўдар па самому Кэллёгу і Чэмбэрлену) — бо-ж гэтыя акты, ухіляючы міравыя спосабы, якія маглі-б вырашыць спор і залагодзіць канфлікт, атручваюць узаемныя адносіны паміж народамі і бясспрэчна прычыняюцца да стварэньня атмасфэры, карыснай для выбуху вайны.

Пасьля ўсіх гэтых крытычных увагаў, якім радавы ўрад, відаць, прыдае характар засьцярогаў з боку ССРР да Трактату, нота выражае, ня гледзячы ні на што, прынцыповую згоду з боку ССРР далучыцца да трактату. У канцы нота кажа, што ў найбліжэйшым часе радавы ўрад зробіць усе патрэбныя фармальнасьці, зьвязаныя з далучэньнем да Трактату.

Такім чынам, можна ўжо лічыць ССРР увайшоўшым у склад дзяржаў сьвету, ахопленых Трактатам, выключаючым, праўда больш маральна, вайну, абвясьціўшы яе — „міжнародавым праступленьнем“.

Трэба толькі напомніць яшчэ і яшчэ, што Трактат Кэллёга, здаецца, навет не прадбачыць запрашэньня да яго падпісу ўсіх дзяржаў сярэдняй і паўдзённай Амэрыкі, дзе амэрыканскі ўрад хоча, відаць, пакінуць сабе „зусім вольную руку“. З свайго боку з дабрадзействаў Трактату (калі ў яго верыць шчыра), ангельскія засьцярогі рашуча выключылі цэлы шэраг дзяржаваў і краёў, якія ляжаць у Афрыцы і Азіі (Аравіі) — на марскім ангельскім шляху ў Індыю. Увесь гэты вялізарны абшар „выключных уплываў і спэцыяльнай заінтэрэсаванасьці Англіі“ ангельскі ўрад выразна выключыў з Трактату, жадаючы таксама на ўсей гэтай вялізарнай тэрыторыі пакінуць сабе цалком „вольную руку“... Ці—прасьцей—тасаваць, скольк і прызнае патрэбным — „вайну, як прылад нацыянальнай палітыкі“...

Кожнаму павінна быць ясна, наскольк і гэтыя амэрыканскія і ангельскія засьцярогі, ня кажам ужо аб француcкіх засьцярогах у Эўропе,—зьмяншаюць і без таго не вялікую „маральную сілу“ Трактату. Асабліва, калі ўспомніць, што якраз выключаньня Англіяй з-пад Трактату тэрыторыі ў Азіі і Афрыцы ў сучасны мамэнт зьўляюцца пляцам страшэннай барацьбы вызваляючыхся да новага самастойнага жыцьця каляровых народаў і—усьцяж завастраючайся канкурэнцыі найбольш магутных імпэрыялістычных дзяржаваў сьвету, няўхільна прарочачай вайну...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Як прайшоў міжнародны дзень камуністычнай моладзі ў Варшаве.

Як ужо даўно інфармавала прэса, у дзень 2 верасьня прыпадаў „Тыдзень міжнароднай камуністычнай моладзі“. Да гэтага дня гатаваліся, як камуністы, так і паліцыя—(яўная і тайная) і пэўна апошнія больш першых. Яшчэ за некальк і дзён перад 2 верасьня, паліцыя зрабіла па ўсей Польшчы масавыя вобыскі і арышты. Аднак, ня гледзячы на ўсе стараньні паліцыі зьліквідаваць сьвяткаваньне гэтага дня, камуністычная моладзь яго ўсё такі сьвяткавала. Як ён прайшоў па ўсей Польшчы—яшчэ няма ведама—прэса ня падае, — але, як гэты дзень прайшоў у Варшаве, жменьку фактаў падае варшаўская прэса. Так 244 нумар санацыйнага „Głosu Prawdy“ піша: „Камуністычныя паходы адбыліся толькі на пляцы Карцэля і на вуліцах—Вольскай, Смочай і Дзельнай. Складаліся яны пераважна з любячых прыгоды „гапов“ (gapiów). Апрача гэтага, на Беластоцкай і на Дзікай вуліцы былі вывешаны камуністычныя транспаранты.

А 6.30 гадз. вечара „ўсе сілы“ камуністаў былі змабілізаваны на Мілай вуліцы, скуль паход з транспарантамі скіраваўся пад Павіяк (адпаведнае мейсца віленскім Лукішкам).

Поўнячы службу на Дзікай вуліцы паліцыянт, заўважыўшы паход, пашоў у найбліжэйшы дом, каб заалярмаваць аб гэтым паліцыю. Калі ён вышаў, дык апынуўся ў сярэдзіне паходу. Пад адрэсам паліцыі пасыпаліся варожыя выкрыкі. Паўстала замяшаньне. Паліцыянт заклікаў натоўп разыйсьціся, а як гэта ня памагло, пачаў страляць у паход. Стрэламі яго ранена 3 асобы: адзін у твар, другі ў галаву, а трэці ў нагу (ў скаковы сустаў). Апрача гэтага, пры разганяньні паходу надаспеўшай паліцыяй, ранены 2 камуністы, аднаму 17, а другому 16 год. Усіх раненых арыштавалі. Па забінтаваньні іх, трох падстрэляных адаслана ў цяжкім становішчы ў шпіталь. Апрача раненых, арыштавана яшчэ 10 камуністаў“.

На нашы лясы.

Міністэрства Прам. і Гандлю распачало працу над будоўляй дзераўнянага порту ў Тчэве.

Мусіць, польскім панам здаецца, што ў Беларусі яшчэ ня чэпаныя пушчы... А ад іх хутка і так астанецца толькі ўспамін...

„Брацтва Рускай Праўды“.

Рэвалюцыйная вайна расейскага пралетарыяту змыла, выкінула за борт жыцьця ўсіх „быўшых вялікіх“: князёў, графоў, царскіх жываедаў-генаралаў, правакатараў і іншых „дабрадзеяў“ расейскага народу.

Але, як-жа ім даравац гэта, як-жа дапусьціць, каб гэтыя „хамы“, „чэрнь упраўляла сама сабой, дый абходзілася без „вялікіх“? Як-жа даравац і спакойна сядзець, калі іх „богам дадзенымі“ „памесьцьцямі“, палацамі, капальнямі і іншымі прыроднымі багацьцямі краю завалацалі гэтыя „дзікія“?

Ніколі і ніякі „культурны“ чалавек ня можа прымірыцца з гэтым варварствам і грабяжом „чырвоных палачоў“!

— Біць іх, сьцерці з твару зямлі!

Ажна скольк і ня білі — нічога, „чэрнь“ геройска змагалася і перамагла дзенікіных, калчакоў, врангеляў і наагул усю памешчыцка-капіталістычную ганьню (свору). Нічога не памаглі і дапамогі загранічных сяброў!

Кепская рада! Але „пазалочаныя“ ня трацілі яшчэ надзеі.

— Яны самі сябе перадушаць, з голаду падохнуць, ня змогуць направіць зьнішчаных вайной фабрыкаў, заводаў, капальняў!— аж, запеніўшыся, крычэлі „руссія патрыоты“ на эміграцыі і ўсімі мажлівымі для іх спосабамі, з пад падлогі, стараліся падставіць нагу, падарваць сялянска-работніцкую адбудову дзяржавы. Арганізоўвалі дывэрсыйныя банды, падтрымоўвалі сабатажнікаў, высылалі і фінансавалі чорнасоценскіх агітатараў і ўсё чакалі „правалу“.

— Вось-вось, ужо-ужо, заўтра, за месяц, трэснуць бальшавікі! — пісалі ў газэтах распаленыя „благародныя“ галоўкі — сяляне паўсталі! Кранштад збунтаваўся! Іх увесь народ ненавідзіць! Хутка вернемся ў сваё „ацечаства“ і расправімся з гэтымі „чырвонаскурымі“!

Але чакаюць месяц, два, пралятае год, другі — ня лопаюць, каб на іх халера! Не паўстаюць сяляне, забыліся, каб на іх трасца, пра сваіх загранічных „мучальнікаў!

І ня толькі не паўстаюць, але, што-год больш замацоўваюць свае заваяваньні, адбудавалі заводы, строяць аграмадныя электрычныя станцыі, купляюць у Амэрыкі трактары, вучацца, стараюцца здабыць кніжную мудрасьць, якая раней была выключным прывілеем „благародных“ і становяцца сілай, з якой навет мусяць лічыцца апякуны „пакрыўджаных „истинно-русских“.

— Няўжо ўсё прапала? Няўжо прайшлі „залатыя дзянёчкі“? — ня хочацца верыць, гэтага быць ня можа! Жон і дзяцей заложым, а не папусьцім свайго „отечества“!

Чакаючы, выжыдаючы, чыста, беденькія, папсулі свае нэрвы, зьдзяцінелі, нераўнуючы, як стары чалавек перад сьмерцьцю і ўсё яшчэ ня трацяць зусім надзеі на нейкі выпадак, счасьце і паўстаньне сялян у „савецкім пекле“. Кожны выбрык якога небудзь бандыта, тэрарыста на тэрыторыі ССРР раздуваўся ў фантазіі „быўшых“ у цэлую паўстанчую армію, прыводзіў у захопленьне, цешыў і дадаваў ім духу і „муства“. І вось гэтыя настроі эмігрантаў выкарыстоўвалі і выкарыстоўваюць у сваіх асабістых мэтах розныя прайдзісьветы-п'яніцы, браты „русской організацыі“ „Братство Русской Правды“, доячы, як каровак, і водзячы іх, як сьляпых, за нос.

Што гэта за арганізацыя, што паслужыла прычынай, імпульсам да яе стварэньня, якія яна мела мэты і яе „працу“ высьвятляе віленская эміграцыйная газэта „Новая Россія“ № 11 з дня 12/VIII г. г., пасьвячаючы цалком усе чатыры старонкі гэтай справе. Ваенныя хмары ўсё больш і больш згушчаюцца на палітычным гарызоньце, — піша ўспомненая газэта.

Ваенныя хмары згушчаюцца! Вось, што ўзварушыла, дадало энэргіі і заахвоціла арганізавацца, ды загадзьдзя, выбіраць сабе пароў-памазаньнікаў! Ведама-ж ужо, з якога боку і супраць каго гэтыя хмары згушчаюцца! Закіпела работа! Пад пратэктаратам вялікага князя Мікалая Мікалаевіча стварылі „Брацтва Рускай Праўды“.

Эпіскап Антоні „соблагоізволіл“ удзяліць асобнай граматай сваё благаславенства для гэтага „брацтва“. Пасыпаліся з усіх бакоў ахвяры, сяброўскія складкі (па 25 зл.)!— Усе ставайце да барацьбы за родзіну і „рускаго хрыста“!—заклікалі ў газэтах. Шчодра фінансавалі арганізацыю вядомыя перад вайной багачы-купцы—Абрыкосаў, Парамонаў і „добрый нѣмец“ Зіферт. (А якую родзіну немец Зіферт хоча бараніць?!) „Штаб“ арганізацыі склалі—генэрал Красноў, быўшы „рэвалюцыянэр“ Бурцаў і нейкі Ламаносаў-Кольберг, які хутка стаў „душой“ арганізацыі; выдаваў газэты, друкаваў на тоненькай бібуле (бачыце, ёсьць і не камуністычная бібула!) брашуркі, эвангельлі, сартаваў і друкаваў „Весткі з Савецкай Расіі“, якія прысылаліся яму ў Бэрлін з Вільні, але, як цяпер высьняецца, і свае ручкі добра грэў на гэтым інтарэсе—надуваў „брацтва“, гдзе і як было можна.

Але галоўным героем, атаманам і кіраўніком паўстанчых атрадаў, „Зялёны дуб“ быў пражываючы ў Вільні Адамовіч-Дзяргач. Хто такі гэты Дзяргач? Дзяргач—беларус. Пасьля Рыскага міру ён нейкі час працаваў, як карэспандэнт, у адной Віленскай (якой ня высьняецца) газэце і фабрыкаваў фантастычныя весткі аб савецкай уладзе і тамашнім жыцьці. Чытачы, мусіць, помняць гэтыя байкі аб людаедзтве, голадзе, мільённых расстрэлах сялян-паўстанцаў, зьдзеках і т. д., якімі былі перапоўнены ўсе тагочасныя газэты. Багатай фантазіяй і здольнасьцяй абдароны чалавек! Не здарма напісаў вядомую кніжку „Тыны і абразкі Палесься“! Але калі з ССРР наладзіліся сякія-такія адносіны, туды паехалі пасльі, камісіі, пачалі пісаць праўду аб іхніх стасунках і гэтыя байкі зрабіліся няўмеснымі ды кампрамітуючымі польскую прэсу — Дзяргача выкінулі і ён апынуўся ў брацтве. Тут для яго здольнасьцяў было шырокае поле! „Атаман“ „Зялёнага дубу“ са сваімі атрадамі робіць напады на савецкія ўстановы, цягнікі, расстрэлівае сотнямі камісараў! Арганізуе паўстанцаў па ўсей Уходняй Беларусі, паўночнай Украіне Пскоўшчыне, навет пад сьцены Крэмля дабіраецца! Разьбівае казённыя склады ў м. Барысаве, нішчыць кожны бальшавіцкі атрад пад Івянцом(?!), вядзе бой з чырвонымі ля мяст. Лужак(!!!) і гэтак далей, канешна... сядзячы ў якой небудзь віленскай кнайпе.

Троха, як бачыце, нерасаліваў, пісаў,

Кантроль над заграпічнай прэсай.

Паліцыйныя ўлады выдалі загад да сваіх падуладных аб кантраляваньні агэнтураў, прадаючых заграпічныя часопісі і газэты.

Гэта быццам з той прычыны, штэ астатняя сьцьвярдзіла прадаваньне забароненых заграпічных газэтаў, якія маюць быць адбіранымі навет ад падарожнікаў, пераехаўшых у межы польскай граніцы.

Ня могуць пагадзіцца.

Мініст. Унутр. Спраў апрацавала праек закону аб хаваньні нябошчыкаў. Але з прычыны паважнай розьніцы паглядаў на гэтую справу М-ва Справядлівасьці, праект ня можа зрэалізавацца.

Зьмена законаў аб прадажы гарэлкі?

Варшаўскія шынкары і рэстаўратары маняцца ў хуткім часе выступіць да ўраду з просьбай дазволу прадаваць гарэлку і ў сьвята, пасьля поўдня, г. з. калі ў царквах ці касьцёлах скончыцца багаслужэньне.

Радавыя ніці ў Варшаве.

У Варшаве зьявіліся радавыя ніці з надпісам „Ленінский Текстильный Трест“, і з яркай чырвонай зоркай. Ніці гэтыя прадаюцца па 30 грашоў шпулька, г. ё., таней, чым ніці польскай фабрыкацыі.

(„За Свободу“! № 206).

Арышт 124-х камуністаў.

3 г. верасьня, а 10 гадзіне вечара варшаўская паліцыя арыштавала ў салі „Саюза насільшчыкаў“ усіх сабраўшыхся там, як іх называе варшаўская прэса, камуністаў-насільшчыкаў.

Сабраныя быццам сярод розных пытаньняў разглядалі і пытаньне сьвяткаваньня „Тыдня Камсамолу“. У канцы паседжаньня быццам былі чутны розныя антыдзяржаўныя выкрыкі. У гэтым часе якраз і зьявілася пільнаваўшая іх даўно паліцыя і заарыштавала ўсіх—разам 134 асобы.

Заграніцай.

Літоўскі афіцыёз аб небясьпецы нападу з боку Польшчы.

Афіцыяльнае „Літоўскае Рэха“ піша, што ў Літве пануе перакананьне, быццам зараз-жа пасьля сэсіі Лігі Нацыяў Польшча нападзе на Літву. Але газэта лічыць такое перакананьне беспадстаўным, бо Польшча ня мае ніякай прычыны напасьці на Літву: ў польска-літоўскім споры ня Польшча, але Літва зьяўляецца пакрыўджанай стараной. Усялякія вострыя выступленьні Польшчы проці Літвы, кажа газэта, маюць толькі мэтай застрашыць Літву, але запраўднай ваеннай акцыі Польшчы проці Літвы баяцца няма чаго. Літоўскі ўрад даў строгі загад, каб пагранічная стража ні ў якім выпадку не дала справакаваць сябе з боку польскіх пагранічнікаў.

Сэнсацыйныя „рэвэляцыі“ англійскай разьведкі ў Кітаі.

Англійская разьведка ў Кітаі падняла алярм: англійскім уплывам у краі ізноў пагражае страшэнная небясьпека. — Радавая агентура, поруч з тайным нямецкім ваенным інструктарам, канспірацыйна паразумеліся з павадырамі паўдзённых нацыянальных арміяў, толькі для віду аб'явіўшым вайну кітайскаму камунізму, і канчальнай мэтай гэтай пякельнай коаліцыі зьяўляецца поўнае высяленьне Англіі з Кітаю... Кантонскі ўрад заключыў быццам тайную ўмову з маскоўскім, умысна дазволіўшы адзін аднаму „навонках“ вельмі востра трактаваць узаемна фактычнага саюзьніка... Асабліва ясна высьветлілася для Кантонскага Ураду вялікая цэннасьць гэтага саюзу—ў вайне з паўночнай арміяй, якая была раскладзена, дэзарганізавана „маскоўскай прапагандай“ цалкам, знамяніта аблягчыўшы кантону поўную над ей перамогу... Роля-ж нямецкіх ваенных спэцыялістаў, якіх тая-ж Масква навербавала ды выслала ў Кітай, зьмяшчалася ў тым, што яны і апрацавалі для Кантону ўвесь плян кампаніі і фактычна выконвалі гэты плян, як ваенныя дарадцы ў галоўным штабе нацыянальных арміяў. Англійскія крыніцы цьвердзяць, быццам у паўдзённай Кітайскай арміі шмат гэтых нямецкіх ахвіцэраў-фахоўцаў з былой арміі Кайзэра, якія страцілі мейсцы ў сябе дома—з прычыны зьліквідаваньня Вэрсальскім Трактатам нямецкай арміі. Гэтыя ваенныя прафэсыяналы, страціўшы ня толькі мейсцы, але і маёнткі—дзякуючы інфляцыі—не маглі ці не хацелі заняцца дома якой цывільнай працай. Дзеля таго пайшлі масова—„да лепшых часоў“—у „запас“ у Кітай. Быццам нямецкі ўрад, ня кажучы ўжо аб радавым, тайна падтрымлівае гэтых ахвіцэраў у Кітаі. Нямецкая апінія лічыць гэтую службу сваіх ваякаў у Кітаі „нямецкім патрыятычным дзелам“, бо-ж, працуючы над зьнішчэньнем англійскай сілы ў Кітаі, тым самым запэўняецца вызваленьнем Нямеччыны з—пад вэрсальскага іга... Для Нямеччыны, апрача таго, адчыняецца ў Кітаі—ў супрацоўніцтве з Радамі—вялізарная будучыня, якая ня будзе баяцца ніякай канкурэнцыі з боку наймагутнейшых марскіх дзяржаваў. Нямецкія і радавыя ваенныя кіраўнікі маюць — з даручэньня кантонскіх павадыроў—ставарыць у Кітаі вялізарную армію, сілай у 50 дывізыяў, азброенную паводле найнавейшых дасягненьняў ваеннай тэхнікі. Ужо цяпер юрыдычнае прызнаньне Кантонскага ўраду з боку Англіі — пасьля зацятай барацьбы з ім — разглядаецца ў Азіі, як капітуляцыя Англіі, каштаваўшая апошняй рэшткаў яе былой вялізарнай павагі ў Азіі. Супрацоўніцтва Нямеччыны, Расеі і Кітаю, іх прышлы ваенны саюз ствoрыць такі вялізарны абшар абсалютна непераможных саюзьнікаў, якім ня будуць страшны ніякія пагрозы блёкадай ці ваеннай інтэрвэнцыяй. Пасьля вызваленьня з-пад англійскага панаваньня Кітаю, наступным няўхільным крокам на шляху ліквідацыі англійскіх уплываў у Азіі будзе—вызваленьне Індыі, якую ня будзе здольная ўтрымаць Англія з мора, як ня здолела Англія ўтрымаць свае былыя валадзеньні ў Брэтані (на цяперашнім паўночна-заходнім абшары Францыі), або ў Амэрыцы.

Далей англійскія страхі рысуюць такі ход падзеяў у бліжэйшую чаргу:—Калі кітайская армія будзе падрыхтавана нямецка-бальшавіцкай інструкцыяй, Комінтэрн пастараецца за ўсялякую цану дэз'арганізаваць грунтоўна англійскія вайсковыя часьці — ў першую чаргу ў Азіі — ў арміі і ў флёце. Пасьля такой падрыхтоўкі Нанкінскі ўраду мае справакаваць канфлікт з Англіяй, які няўхільна пяройдзе ў вайну. Гэта будзе сыгналам для ўсіх азыяцкіх народаў, якія стогнуць пад англійскім панаваньнем — распачаць агульнае паўстаньне проці англійскіх уладаў. У выніку такой „камбінаванай тактыкі“ Англія будзе раз назаўсёды выкінена з Азіі. Быццам ужо ў Індыі шырока працуе бальшавіцкая прапаганда, а таксама і ў Эгіпце, выкарыстоўваючы сьвежа завастрыўшуюся ненавісьць да Англіі—ў рэзультаце апошняга разгрому парляманту і ўвядзеньня дыктатуры караля Фуада.

Так пішуць і так бачаць будучыну сваю ў Азіі „англійскія страхі“, пэўне ж пачуваючы, апрача ўсіх падрыхтваньняў з боку сваіх заклятых ворагаў, яшчэ і ня зусім супакойнае сумленьне свае ўнутры...

Радава-амэрыканскае зьбліжэньне

Нямецкая прэса паведамляе, што трэба ў хуткім часе спадзявацца радава-амэрыканскага зьбліжэньня, што мела-б вялікае значэньне і для Нямеччыны, галоўнае ў сувязі з нядаўным англа-францускім паразуменьнем. Прэса падае, што амэрыканскі (Зл. Ш.) сэнатар Тымос у гутарцы з Літвінавым ў Маскве, прырок падняць у Вашынгтоне справу прызнаньня Злуч. Штатамі „de jure“ Радавага Саюзу, што дало б ім магчымасьць навязаць беспасярэдні гандаль між сабою. Ны малае значэньне ў радава-амэрыканскім зьбліжэньні нямецкая прэса прыпісвае таму, што „Таварыства Культурнага Саюзу Радаў з заграніцай“ аблягчыла ў гэтым годзе наездку ў ССРР 50 вядомым амэрыканскім вучоным.

Крыгалом „Красін“ ізноў працуе.

Нядаўна радавы крыгалом „Красін“, наражаючы сваю экспэдыцыю на страшэнную небясьпеку, паехаў на ратунак фашыстаўскае экспэдыцыі, якую аглаўляў італьянскі генерал Нобіле. Паехаў і дакапаў мэты, чым задзівіў увесь цывілізаваны сьвет. Але частка з гэтае экспэдыцыі, якая мела заданьнем на самым Паўночным полюсе ўваткнуць італьянскі фашыстаўскі сьцяг і папежскі крыж, на крыгалом „Красін“ не папала. Трэба думаць, што яна загінула.

„Красін“ пасьля адпачынку ізноў атрымаў загад радавай улады адправіцца на шуканьне рэшты італьянскае экспэдыцыі, якую, калі яна не хаваецца ў нэтрах Паўночнага акіяну, спадзяецца знайсьці.

З зьезду каапэратараў у ССРР.

Нядаўна ў Маскве адбыўся зьезд каапэратараў ССРР. Апрача каапэратараў з ССРР, на зьезд прыбылі і заграпічныя каапэратары — з Англіі, Францыі, Нямеччыны, Польшчы і г. д.

Пасьля стараннага разгляду каапэратыўнай працы ў ССРР, заграпічныя каапэратары былі вельмі зьдзіўлены вялізарнымі пасьпехамі радавай каапэрацыі, якімі, паводле іх слоў, ня можа пахваліцца ні адна капіталістычная дзяржава ў сьвеце! Таксама, як і пасьпехамі каапэрацыі, ні адна капіталістычная дзяржава ў сьвеце ня можа пахваліцца і лікам сяброў каапэратываў, якіх цяпер у Радавым Саюзе ўжо больш 20 мільёнаў, ня гледзячы на тое, што радавы каапэратыўны рух мае за сабой ледзь 10 гадоў, уключаючы сюды і гады хатняй вайны, калі ня толькі каапэратыўная, але і ўсялякая мірная праца была не магчымай.

Захопленыя вялікімі пасьпехамі радавага каапэратыўнага руху, заграпічныя госьці-каапэратары выразілі зьезду вялікі лік падзякаў і проста задзіўляючых од'зываў аб радавай каапэрацыі.

Напрыклад, адзін, сівы ўжо каапэратар сказаў зьезду: „Вы перагналі Эўропу, у вас каапэрацыя зрабілася запраўдным гаспадаром рынку. У Эўропе-ж яна толькі невялічкая сіла, што дзе ў чым направуляе рынкавыя стыхіі“.

Такі-ж пагляд выказваюць і сумесна французкія, англійскія і іншыя каапэратары, кажучы, што ў Міжнародным Каапэратыўным Саюзе няма ні аднэй такой вялізарнай каапэратыўнай арганізацыі, ня гледзячы на тое, што каапэрацыя ў Эўропе існуе ўжо дзесяткі гадоў.

„Мы проста зьдзіўлены з таго нячуванага разьвіцьця радавай каапэрацыі. У хуткім часе, мы наладзім да вас вялікую дэлегацыю з выдатных каапэратараў Захаду, каб дакладна вывучыць вашы задзіўляючыя дадасягненьні каапэрацыі“, кажуць у канцы заграпічныя каапэратары да зьезду радавых каапэратараў у Маскве.

Кастрычнікавыя манэўры радавай арміі.

„Усходняе Агенства“ даведалася, быццам у кастрычніку адбудуцца вялікія манэўры чырвонай арміі на абшары стратэгічнага трыкутніка—Кіеў—Чарнігаў—Гомэль. Ваеннай акцыяй на манэўрах, у якіх мае прыняць учасьце каля 300 тысяч рэгулярнай арміі, будзе кіраваць асабіста народны камісар вайны; кіраўнаком палітычна-агітацыйнага боку манэўраў мае быць Бубноў.

Кінь пясьняр.

Кінь пясьняр ты сум жыцьцёвы:
Роспач гору не паможа;
Узьвіся песьняй над дубровай,
Глянь навокал — як прыгожа!
Там ня ўбачыш раздарожжа,
Там прастору гмах — раздольле
Дадасьць сіл ў змаганьні болей —
Кінь песьняр свой сум жыцьцёвы!

Сонца ласкай там сьмяецца,
Прамяністым бліскам зьзяе;
Глянеш — сэрца ўскалыхнецца!
О, краіна дарагая,
Хто тваю не пакахае
Любасьць пушчаў ды разлогаў,
Дзе так гора, бедаў многа,
Сонца ласкай дзе сьмяецца...

Кінь пясьняр ты сум жыцьцёвы:
Нас ня зломяць ветрагоны —
Моцны сэрца гарт сталёвы,
Віхуры запал шалёны
Сьціхне... Родныя загоны
Закрасуюць пышна ў полі.
Адно працы, працы болей!
Кінь пясьняр свой сум жыцьцёвы.

М. Васілёк.

Нямеччына рубам ставіць справу скасаваньня акупацыі

Амэрыканскае прэсавае агенства даведалася, што на канфэрэнцыі Штрэзэмана з Пуанкарэ і Брыянам у Парыжу абгавораны быў цэлы камплект справаў, зьвязаных з француска-нямецкімі стасункамі,—асабліва ў справе акупацыі. Як нямецкая, таксама і француская староны трымаюць у вялікім сэкрэце зьмест сваіх размоваў. Аднак-жа, з Жэнэвы пішуць, што нямецкі ўрад паставіў рубам справу скасаваньня акупацыі цалкам, выслаўшы да ўсіх акупацыйных дзяржаваў такога зьмету ноту. Нямецкі ўрад дабіўся таго, што ў часе жэнэўскага зьезду паміж саюзьніцкімі вялікімі дзяржавамі і Бэльгіяй будуць ісьці фармальныя перагаворы ў справе поўнага скасаваньня акупацыі. Нямецкі ўрад, пазываючыся на палітычныя, юрыдычныя і маральныя правы Нямеччыны, прызнаныя ей трактатамі, трэбуе фармальнага высьвятленьня справы да канца ад акупацыйных дзяржаваў. Нямецкі ўрад трэбуе, каб гэтыя дзяржавы заявілі ясна, дзеля якой мэты яны хочуць утрымаць надалей акупацыі, калі Нямеччына споўніла ўсе варункі, прадбачаныя ў Вэрсальскім трактаце дзеля перадтэрміновага скасаваньня акупацы.

Перагаворы ў Жэнэве пачнуцца зараз пасьля прыезду туды старшыні нямецкай дэлегацыі канцлера Мюллера. У перагаворах, апрача Мюллера, прымуць учасьце старшыні — англійскай дэлегацыі, лерд Кушэндэн,—францускай—Брыян, італьянскай—Шалойя, японскай—Адаччы і бэльгійскай — Тіманс. Ані Польшча, ані Чэха-Славакія, ані якая іншая дзяржава, заявіўшыя аб сваей заінтарэсаванасьці ў справе акупацыі Надрэніі, у перагаворах прымаць учасьця ня будуць. У гэтым—пэўная перамога Нямеччыны. Ці перагаворы давядуць да пажаданых для немцаў рэзультатаў, гэта—іншая рэч.

Завастрэньне рэпрэсіяў проці камуністаў у Фінляндыі.

Маскоўская прэса паведамляе, што — у зьвязку з папсаваньнем у апошні час радава-фінляндзкіх стасункаў—у Фінляндыі пачаліся новыя арышты камуністаў. У працягу 2 дзён арыштавана 40 радавых грамадзян, якім закідаецца прапаганда камунізму.

што біўся з „Краснымі“ каля Івянца і Лужак, якія знаходзяцца на гэтым баку кардону — у Польшчы. Нічога, „культурныя“ навет і не заўважылі гэтак пасьлеплі, падурнелі ад радасьці! Чытаюць „Русскую Правду“, „Новую Россію“, якія выходзілі ў Бэрліне і куды накраўляў свае „рапарты“ — Дзяргач і аж падскакваюць, хваляць „геройскага“ атамана!

— Вот когда ім канец прыходзіт! — Пасыпаліся складкі з Бэрліна, Данцыга, Парыжу на „Зялёны дуб“ і пэўне-ж ня міналі рук „атамана“. Прысылаў той жа Кольберг тысячы антысавецкіх брашур, эвангеліі, абразы па адрасу другога „брата“, Дзяргачовага таварыша—Густалеса. Густалес—растрыга—поп, цяпер псаломшчык, б. муж даверыя 20-га нумара (Руск. Нар. Об'единеніе), член „левай“ беларускай арганізацыі (?!—хіба Умястоўскага, або Вярнікоўскага?!), пэўне-ж ня дурак быў рызыкаваць свеёй галавой йсьці раздаваць гэтыя эвангеліі і абразы сярод „жаждающчаго слова Божыя і ўгнеценнага рускага народу“, а папросту літэратуру прадаваў на макулатуру ў дробныя крамкі (ўкручываць селядцы), а абразы і эвангеліі сярод тутэйшых—„прававерных хрысьціян“. Грошы, сумесна з Дзяргачом і трэцім сябрам, Крэчэтам сьпеваком Бого-духавага манастыра, прапівалі і гэтым канчалі сваю „апостальскую“ міссію.

„Подвігі“ атамана і яго атрадаў так падбадрылі „чорненькіх“ ажна генерал Красноў „воодушэвілся“ і распачаў пісаць сэрыю раманаў, як пісаў абапёртых на „бывшых і сушчэствуюшчых“ фактах, пад тытулам „От Краснаго Знамені к Двуглаваму Орлу“, адзін з якіх пад назовам „Белая Сьвітка“ ўжо выпусьціў у „Белы“ сьвет.

Красноў у сваім рамане „перашчагаляў“ навет „атамана“, — чаго там толькі няма! Уся Усходняя Беларусь, ды і чуць не палова ССРР, аж енчыць ад паўстанцаў, у кожнай вёсцы маецца „штаб“, кабеты шчыпаюць корпію, перавязваюць раненых, баі ідуць на кожным шагу, а ўжо камісараў набіта, дык ні прайсьці, ні праехаць ня можна!

Доўгі час Дзяргач праспакойненька „працаваў“ і жыў сабе прыпяваючы, але вось гэты разгарачаныя яго весткамі, ды раманамі Краснова, „патрыатычныя“ галоўкі пачалі дакучаць.

Адзін з Віленскіх манархістаў, ахвяраваўшы на „Зялёны дуб“ значную суму грошай, захацеў сваімі вачыма пабачыць гэтых малайцоў „паўстанцаў“. Але атаман тут знайшоўся: наняў нейкіх забулдыгаў і выставіў на паказ. Толькі вось, падляцы пасьля прабалталіся і гэта „штука“ стала цяпер вядомай.

Пачаў прыставаць малады „патрыёт“ Трайковіч да атамана з просьбай выслаць і яго на „барбу“ з бальшавікамі. Дзяргач, вывудзіўшы ад яго нейкую сотню залатовак, бесканечна адкладваў тэрмін выезду, а між тым у газэтах пісалі пра разудалага „атамана“, які, быццам, знаходзіўся і бароўся ў ССРР. Трайковіч, сьцяміўшы справу, напісаў у „штаб“ данос, але адтуль адказалі — мы ведаем, хто такі Дзяргач, але ён нам патрэбны, прыказваем слухаць і падпарадкавацца яго прыказам. Ускорасьці Трайковіча направілі ў „дзела“. Атаман парадзіў зрабіць нож, які і быў зроблены са старой шашкі і пры пасярэдніцтве брата Брука направілі ў савецкае прадстаўніцтва з мэтай забойства консула. Перад ад'ездам Трайковіч перадумаў, кінуў нож і ўзяў купленны для яго Дзяргачом раней рэвальвэр „бульдог“. Як ведама, гэта забойства ня ўдалося, самага Трайковіча там застрэлілі.

Гэтым-жа „брацтвам, як падае тая-ж газэта, была вызвана ў Варшаву і напраўлена ў кансулят паўідыётка Валентыновіч. Пра Кавэрду, дык газэта замаўчывае. Пішуць, што Кавэрда быў раней прыяцелям Трайковіча, даваў яму грошы, толькі ў апошнія часы перад „работай“ неяк палаяўся, калі Трайковіч абразіў яго і бацьку, кажучы, што яны спрыяюць бальшавікам.

З аднаго гнязда птушачкі! Тая самая „брацкая“ рука пакіравала і яго на гэта подлае дзела! У іх-жа інтарэсе было і ёсьць „згусьціць ваенныя хмары, выклікаць вайну, чаго яны былі пэўнымі пасьля забойства Войкава. Ня ўдалося— папхнулі Трайковіча, гэтага застрэлілі, знайшлі яшчэ вар'ятку Валентыновіч, а „ва что-бы то ні стала“ хацелі дапяць свае мэты.

У леташнім годзе, на энэргічнае дамаганьне савецкае ўлады, паміж іншымі, і атамана Дзяргача выгналі з Польшчы і ён пераехаў у Данцыг. Там, знюхаўшыся з такім-жа „героем“ „абщественным дзеятелем“ — Фабрыцыусам, прадстаўніком князя Кірылы Уладзіміровіча, грашавым распарадзіцелям „Расійскага Краснага Креста“ і ён-жа сэкрэтаром Папскага Камітэту дзеля дапамогі бедным дзецям праваслаўных—сумесна пачалі „працаваць“.

Рабілі „благотварыцельныя“ вечарыны і... каго дык каго, а сябе і свае брухі добра ўблагатваралі! Грошы, якія даваў катал. эпіскап Рурк, дзеля раздачы бедным дзяцям Фабрыцыўсу—большую частку хавалі ў свае кішані. Прадавалі нейкія мэдыцынскія пакеты, якія нібы меліся адправіць у ССРР „раненым партызанам“ і г. п. „штучкі“. Цяпер, калі ўвесь гэты бруд, подласьць, далей укрываць было немагчыма і яна вышла на яў, кампрамітуючы саміх „благародных“ і іх паскудную работку, яны зваліваюць віну на правакацыю Г. П. У. (савецкай чрэзвычайкі). З Дзергача робяць яе агента, які выслаў Трайковіча нібы, папярэдзіўшы сав. консульства, пішуць, быццам меў сувязь з віднымі камуністамі і агентамі III-га інтэрнацыяналу.

Калі гэта праўда, дык трэба толькі дзівіцца „спрыту“ гэтага „ўсемагутнага“ Г. П. У., але гэта ёсьць папэўне хлусня, стараньне прыкрыць свой маральны воблік. Калі Дзяргач быў запраўды савецкім агентам, дык чаму-ж ён не папярэдзіў а пакушэньні Б. Кавэрды? Яму-ж не магла быць няведамай гэта справа! Штаб „Брацтва Русской Правды“ мусіць добра ведаў, хто такі Адамовіч-Дзяргач, калі пісаў Трайковічу—„Яго добра ведаем, але ён нам патрэбны“... —

Агент ня быў-бы патрэбным! Ведалі, што ён аванцюрыст з пад цёмнай зоркі, але-ж на такую пачотную місію „згушчаць ваенныя хмары“ маральны, чысты чалавек ня згодзіцца, дык канешна „быў патрэбным брацтву такі Дзяргач! Брудпае дзела—бруднымі рукамі і робіцца!

Наша хроніка.

Зьезд Акружное Управы Т-ва Белар. Школы ў Косаве. У нядзелю, 2-га верасьня, адбыўся павятовы зьезд прадстаўнікоў ад гурткоў Т. Б. Ш. з Косаўшчыны. На зьездзе былі прысутнымі паслы з Сялянска-Работніцкага Клюбу—др. І. Дварчанін і Я. Грэцкі. Паслы, падчырківаючы розьніцу між культурнаю ўстановаю—Т. Б. Ш. і Клюбам, як арганізацыяй палітычнай, указалі, што сялянска-работніцкія паслы мусяць бараніць усякія справы, якія ты[...]цца жыцьця беларускіх працоўных, у [...]м ліку і культуральных. Паслы віталі зь[...]зд і, паведамляючы аб прыкрыцьці Галоўнай Управы, заклікалі да дружнай працы над падачай дэклярацый на родную школу.

Зьезд прыняў рэзалюцыю пратэсту проці прыкрыцьця Галоўнай Управы і пазнаёміўшыся з палажэньнем на мясцох—выбраў новую Акружную Управу. Падрабязныя інфармацыі будуць паданы ў асобнай карэспандэнцыі. Зьезд закончыўся беларускім народным гімнам „Ад веку мы спалі“.

„Клюб Беларускай Інтэлігенцыі“. Ад „нечага делаць“ і з жаданьня зрабіць нейкую кар'еру, а перадусім дастаць ад „некага“ добры авансік, чужая адраджэньню і вызваленьню беларускага Народу віленская „тоже белорускаяˮ інтэлігенцыя, манілася залажыць нейкі „Клюб Беларускай Інтэлігенцыі“. Але гэтаму ня суджана было збыцца (пэўна з браку „авансіка“) і два з трох яго закладчыкаў выехалі на сталае жыцьцё з Вільні; адзін—Я. Мамонька—ў Латвію, другі б. п. вядомы не з пасольства, а з п'янства Аўсянікаў на правінцыю. Але астаўшыся трэці („дзядзька“ Тодор) усё яшчэ маніцца з'арганізаваць гэты клюб, аб чым паведамляе ў „Грамадзяніне“.

У разе пасьпеху (ў якім мы пэўны, бо ўсім „тоже белоруссам“ патрэбны толькі грошы, якія яны і дастануць за гэта „oficie“) родзілі-б назваць гэты клюб уласным сваім менем: „Клуб тоже Бѣлорускай Интелигенціи“, бо ж там ня будзе ніводнага запраўднага беларускага інтэлігента — запраўднага сына свайго працоўнага народу, які жыў-бы жыцьцем і думаў бы думкамі радзіўшых і кормячых яго сярмяжных беларускіх масаў.

Падзяка. Беларускае Навуковае Т-ва складае шчырую падзяку наступным установам і асобам за прысланыя праз Белар. Каап. Банк у Вільні на тэрміновы рахунак № 17 ахвяры і складкі на „Дом Беларускае Культуры ў Вільні“ (сумы паказваюцца за ўтрыманьнем паштовых расходаў на дастаўку): 1) Вацлаву Філіповічу—1 зл. 95 гр., 2) Працаўнікам Пінскага Аддзелу Белар. Каап. Банку—2 зл. 45 гр., 3) Паслу ў Сойм гр. Ігнату Дварчаніну—40 зл., 4) вёсцы Радзюкі за прысланыя праз Навагрудзкую Акружную Управу Т-ва Бел. Шк.—9 зл. 95 гр., 5) Паўліне Дуброўскай — 9 зл. 95 гр., 6) Рыгору Цецка і іншым—15 зл. 90 гр., 7) Пятру Сяргіевічу — 2 зл., 8) Яну Смыку — 2 зл. і 9) Грыгору Кабзаў—1 зл.

Рэгістрацыя Бацькаўскага Камітэту В. Б. Гімназіі. Віленскі ваявода зарэгістраваў Бацькаўскі Камітэт Віленскай Беларускай Гімназіі, які атрымаў канцэсіі на В. Б. Гімназію. (Канцэсію на гэтую і на Радашкаўскую Беларускую Гімназію мела да свайго „завешаньня“ Т-ва Беларускае Школы).

Камітэт складаецца з б. дырэктара Астроўскага, М. Кэпэля, сьв. Каўша і іншых. Як ведаем, раней яго ой, як доўга зарэгістроўвалі! Цікава!

Міжнародны дзень камуністычнай моладзі ў Віленшчыне. Як сапраўды прайшоў міжнародны дзень кам. моладзі ў Зах. Беларусі, трудна ведаць, бо няма падрабязных інфармацыяў ў прэсе (з пэўных прычын). 201 нумар „Kur. Wil.“ піша аб ім наступнае:

„У нядзелю, 2-га верасьня, паводле атрыманых паліцыяй інфармацый, у сувязі з камуністычным сьвятам, т. з. міжнароднага дня моладзі,—камуністы прыгатоўвалі маніфэстацыі на абшарах віленскага ваяводзтва. Маніфэстацыі мелі сьведчыць „у абліччы цэлага сьвету“ аб жывучасьці Камуністычнай Партыі ў Польшчы. Але пляны віленскіх камуністаў спаралізавала чуйнасьць уладаў. Прыгатаваньням палажыла „крэс“ праведзеная яшчэ ў пярэдадні сьвята акцыя (гэтай вобыскі і арышты.— Рэд.). Дзякуючы гэта акцыі на абшарах цэлага ваяводзтва панаваў поўны спакой, толькі ў некатарых мясцовасьцях былі вывешаны чырвоныя штандары. У Вільні 2-га верасьня камуністы былі с'арганізавалі на Кіеўскай вуліцы паход з транспарантамі. Сільны аддзел паліцыі разагнаў дэманстрантаў, канфіскуючы транспаранты.

Арыштавана каля 30 чалавек, між якімі і „выбітны“ сябра Кам. Партыі Танэнбаўм.

Адмова Ваяводзтва расейскім манархістам. Апошнімі днямі, пражываючыя ў Вільні расейскія манархісты, якія прымусова высяляюцца з граніцаў Польшчы, прасілі Віленскае ваяводзтва аб устрыманьні пастановы іх высылкі з Польшчы 6-га верасьня.

Ваяводзтва на гэтую просьбу адказала адмоўна—манархісты (5 чалавек) выселены.

Яшчэ забастоўка. У Вільні забаставалі работнікі, працуючыя дома для магазынаў гатовай вопраткі. Бастуючыя дамагаюцца 30 прац. падбаўкі платы.

Аграніченьні ў запамогах для беззаботных. На падставе распараджэньня Міністэрства Працы і Грамадзкай Апекі, у Вільні ўводзяцца далейшыя аграніченьні ў атрымліваньні запамогаў безработнымі фізычнымі працаўнікамі. Пачынаючы з 1-га верасьня, пазбаўлены дапамогі ўсе безработныя, утрымліваючыя менш чым 3 асобы. Найбольшы час з карыстаньня запамогаў акрэсьлены максымальна на 52 тыдні—год.

Звальненьне з Слонімскага вастрогу 7-х паліт-вязьняў. 15 жніўня г. г. з слонімскага вастрогу звольнены пад надзор паліцыі 7 паліт-вязьняў у тым ліку і б. сэкрэтар Слонімскай Акр. Управы Т-ва Бел. Школы, А. Лябецкая, арыштаваныя ў сакавіку г. г. Прычыны звальненьня—„brak dowodów“??!

Забастоўка вязьняў. З прычыны кепскіх адносінаў турэмнай адміністрацыі да паліт-вязьняў у часе спацэру ў Слонімскім вастрозе, вязьні ўжо паўтара месяца як ня ходзяць на спацыр, жадаючы людзкіх адносінаў адміністрацыі. Ня гледзячы, аднак, на гэта, уладамі для зьліквідаваньня забастоўкі нічога ня робіцца.

Камуністычная прапаганда ў Слонімшчыне. У ноч з 28 на 29 жніўня ў ваколіцах Слоніма на важнейшых дарогах, у вёсках і ў маёнтках былі павывешваны чырвоныя сьцягі з надпісамі, заклікаючымі супроць імпэрыялістычнай вайны, за рэвалюцыю, да абароны СССР і т. п.

У ноч з 1 на 2 верасьня перад Міжнародным Днём Моладзі („Мюдам“) было раскідана шмат камуністычнае літэратуры, заклікаючай да дэманстрацыяў у дзень 2-га верасьня.

Абакралі паліцыйную касу ў Слоніме. Надовяшняй ноччу няведамыя зладзеі дабраліся да гаспадарчага аддзелу павятовай каманды дзяржаўнай паліцыі ў Слоніме, і разьбіўшы касу, уцяклі з „венкшай“ сумай грошай.

Пагоня і сьледзтва—бяз рэзультату. І паліцыя ў небясьпецы перад зладзеямі.

Арышт камуністаў у Беластоку. Як інфармуе прэса, апошнімі днямі ў Беластоку арыштавана 5 камуністаў. За шостым, які ўцёк, разаслана пагоня.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Характэрны абразок.

(Вёска Малеч, Пружан. пав.).

Праходзіць жніва, а за ім наблізжаюцца васеньня дажджлівыя дні, а там і зіма са сваімі доўгімі сумнымі вечарамі. Бяда ізноў пачне заглядаць у хаты бедных сялян. Да эканамічнага ўціску, надта даўшагася ў знакі нашаму сялянству, дабаўляецца новы, нацыянальна-культурны ўціск—Рэгіяналізм—якога плады прыходзіцца ўжо бачыць. Тыя прыгожыя словы „направячаў“, тыя дэкляраваныя залатыя горы для нацыянальных меншасьцяў пачынаюць з новай сілай праводзіцца ў жыцьцё. Яшчэ вясной некалькі больш сьвядомых хлапцоў рашылі залажыць Гурток Т-ва Бел. Шк. Выпаўніўшы ўсе фармальнасьці і запоўніўшы дэкларацыі, наслалі праз Галоўную Управу старасьце на зацьверджаньне.

Прайшло пару месяцаў доўгага чаканьня. Што-ж: у канцы мы атрымоўваем адказ, з тэй прычыны, што з пасярод дзесяці чалавек, запоўніўшых дэкларацыі, шэсьць аказалася без „obywatelstwa polskiego“. З пасярод гэных шасьцёх ёсьць бывшыя „członkowie“, памершага „kółka młodzieży“. Характэрна, што як сябры „кулка млодзежы“, дык маюць абывательства, а як сябра Т-ва Бел. Школы, дык не! Усе гэтыя шэсьць хлапцоў ёсьць мясцовага ўраджэньня жывуць і жылі тут праз цэлы час, за выняткам ад 1915—1922 г. (час вайны), выпаўняюць усе абавязкі, як панствовыя, так і грамадзкія, мелі права голасу пад час галасаваньня у самаўрады і Сойм, а цяпер чамусьці згубілі свае абывательства!

Вось, як сустракаюцца першыя крокі нашай працы. Вось, якое выпаўненьне тых прыгожых слоў і дэкларацыяў!

Усе за працу!—вось наш кліч, у адказ на перашкоды. Усе да сьвету, бо няма тэй сілы, якая здолее нас трымаць у цемры.

Сьвядомы.

Панскія „справачкі“.

(Слонімшчына).

У солтыса К. Сабалеўскага з ак. Мізгіроў, Дзевяткаўскай гміны, Слонімскага пав. выкрыта надужыцьці, сягаючые да 1.300 зл. Грошы гэтыя—сьцягнутыя на сваю карысьць—падаткі з бедных, аблітых крывавым потам сялян-беларусаў.

Сабалеўскі праз увесь час з сэквэстратарам Шапавалам старанна забіраў у бедякоў апошнюю вопратку за падаткі.

Аднак, дзякуючы непаразуменьню паміж войтам нашай гміны і Сабалеўскім, ашуканства гэтае выкрылася. Тады солтыс начаў вінаваціць у гэтай дэфраўдацыі войта, прыймаючы на сваю долю толькі 400 зл.

Відаць, што яны абодва варылі гэтую „кашу“.

Ня гледзячы на гэта войт усё-ж прадаўжае „ужэндоваць“.

А колькі ёсьць яшчэ ня выкрытых гэткіх панскіх „справачак“!?

Сусед.

Вынікі п'янства.

(Маладэчанскі пав., Палачанская гм.).

У нядзелю 12/VIII.—28 г. хлопцы з в. Хажова і дворныя парабкі, напіўшыся гарэлкі, моцна зьбілі Моніта Кастуся і Зьмітрука Сіракващава—жыхароў з в. Груздова.

Вельмі кепскае ўражаньне робяць такія выпадкі, калі бачыш, што паасобныя вёскі не вядуць барацьбы за палепшаньне свайго быту, а наадварот б'юцца паміж сабою.

Дык сяляне! Кіньце вы піць гэтую атруту, а лепей той грош аддайце на газэту, якая бароніць вашыя інтарэсы.

Чытаючы газэту, Вы навучыцеся, як трэба жыць і змагацца за лепшае жыцьцё.

І. К.

„Айцы“ дзяруць!

(в. Падвялікае, Слонімскага пав.).

Селянін вёскі Падвялікае, М. Скрундзь, у мінулым годзе навазіў гною і насеяў жыта на зямлі, якая належыць да Скрундзяўскае парафіі, умовіўшыся перад гэтым з ксяндзом даць яму трэцюю часьць ураджаю.

Бедны селянін цешыўся, што будзе мець троха хлеба для дзетак, але калі прышлося зьбіраць—ксёндз зажадаў ня трэцюю часьць, як умовіліся, а палавіну ўсяго жыта.

Нічога не памаглі просьбы, „ojciec duchowny“ не хацеў навет многа гаварыць.

„Асьветная“ праца „Koła Młodzieży“.

Гурток Т-ва Белар. Школы ў м. Казлоўшчыне пастанавіў наладзіць спэктакль-вечарыну ў в. Задвор'е, на дзень 12/8. Па дазвол паслана было больш як за тыдзень перад гэтым, а атрымалі тады, калі за 5 гадз. артыстам трэба было выходзіць на сцэну. Дзеля гэтага не маглі паведаміць суседніх вёсак.

Да таго знайшлася і ў в. Задвор'е адзінка, якая старалася не дапусьціць да ладжаньня спэктаклю, гэта арганізатар „Koła Młodzieży“ ў гэтай-жа вёсцы, Б. Чэраховіч. Чапляўся ён перш да сцэны, а пасьля страшыў гаспадара дому, што беларускія артысты ня маюць мо' дазволу, дык за гэта караны будзе ён—гаспадар. Балела яму, відаць, тое, што перад гэтым ладзіла спэктакль „Koło Młodzieży“, але былі на ім толькі некатарыя сваякі артыстаў.

Ня гледзячы на ўсё гэта, спэктакль адбыўся. Публікі было многа. Артысты адыгралі свае ролі добра. Чысты даход у суме 30 злотых пайшоў на карысьць бібліятэкі-чытальні

Змагар.

Брахня папа.

(Вялейшчына, Войстамскай гм.).

Поп Рачагоўскай парафіі, Войстамскай гміны, прыехаўшы на сьвята Гальяша ў вёску Нарочу на кірмаш, каб зарабіць „штокольвечы“ сабе ў кішаню, і пабачыўшы, што сяляне ўжо ня надта яго любяць, заззлаваў і, стаўшы на ганку царквы, пачаў прамову, у якой лаяўся на сялян за тое, што апошнія пачалі арганізоўвацца і жадаць лепшага жыцьця.

Відаць, што і ў папа трасуцца лыткі са страху, бачучы, як сяляне з кожным днём усё больш і больш даведваюцца, хто такі поп і якую ролю адыгрывае ён у закабаленьні працоўных масаў.

Варановіч.

Садзяць „культуру“.

(Друя, Браслаўскага пав.).

У нашым мястэчку Друя жыве асаднік Яжвіхоўскі. Як вядома, ён атрымаў зямлю за верную яго „службу“. Але гэты асаднік, насадзіцель „культуры“ на „барбажыньскіх“ „Крэсах“, як ведама, з панскага роду і працаваць на зямлі не захацеў, баючыся мець на сваіх руках гэтых праклятых „мужыцкіх“ мазоляў. Такім чынам, зямлю ён хутка аддаў у арэнду, а дастаў сабе лягчэйшую пасаду—рэстаўрацыю. Цяпер дык ужо, напэўна, пры помачы гарэлкі будзе сеяць заходнеэўрапэйскую „культуру“.

П.

Нам пішуць яшчэ, што:

× **Дзевяткаўская гмінная рада** ўхваліла ў бюджэце на 1928/29 год 600 зл. на Віленскую Беларускую Гімназію, бо ў гэтай гімназіі вучацца хлапцы з нашага Слонімскага павету. Але пан стараста не знайшоў патрэбным гэтакія грошы аддаваць на асьвету беларусаў і прызнаў толькі 200 зл. і то на Навагрудзкую. Вось табе і „саможонд“! Вось і „дэмакратыя“!

У в. Крываногава, Усялюбскай гм. здарыўся прыкры выпадак: на вясельлі людзі панапіваліся ды самі сябе пакалечылі. Старэйшыя сяляне і моладзь, якія лічаць сябе сьвядомымі, мусяць глыбока задумацца над гэтым выпадкам і прыняць адпаведныя меры, якія-б дапамаглі гэтаму. Найлепей было-б арганізаваць Гурток Т-ва Бел. Шк. і такім шляхам даць зразумець сялянам, што з іх цемры карыстаюцца толькі іх ворагі.

З Радавае Беларусі.

Сярод пісьменьнікаў, паэтаў і літэратараў.

Цішка Гартны хутка заканчывае трэцюю і апошнюю частку свайго раману „Сокі Цаліны“ пад назвай „Крыжавыя дарогі“.

Міхась Зарэцкі напісаў для Беларускага тэатру вялікую п'есу ў 4-х дзеях пад назвай „Віхор на балоце“. П'еса адбівае жыцьцё сучаснага гораду.

Васіль Сташэўскі падрыхтаваў для надрукаваньня новы зборнік сваіх п'ес для вясковага тэатру.

— У Маскве, на Усесаюзным зьезьдзе пралетарскіх пісьменьнікаў ад „Маладняка“ прысутнічала дэлегацыя з сямі асоб: Я. Ліманоўскага, Лынькава, Мазуркевіча, Вечара, В. Каваля, Р. Мурашкі і Н. Маркава.

— Пры Менскай філіі „Маладняка“ з'арганізавалася група сцэнарыстых-маладнякоўцаў, якія паставілі перад сабою мэту ў першую чаргу вывучэньне тэорыі і тэхнікі кіно-мастацтва.

— 8-га красавіка г. г. адбылося дзесяцілецьце літэратурнай дзейнасьці беларускага паэта Міхася Чарота.

— 5-га красавіка г. г. адбылася нарада беларускіх пісьменьнікаў на пытаньні ўтварэньня рэпэртуару для беларускіх тэатраў.

Нарада даручыла Нар. Каміс. Асьветы пераглядзець аўтарскія стаўкі ганарару. За лепшыя п'есы пастаноўлена выдаваць таксама і прэміі.

Баліцкаму даручана падняць пытаньне ў адпаведных органах аб адчыненьні ў Менску Дому Беларускіх пісьменьнікаў.

Працу аб утварэньні Дому Пісьменьніка нарада даручыла народнаму паэту Якубу Коласу.

Прыняты яшчэ рад пастановаў, якія скіраваны ў бок паляпшэньня справы па ўтварэньні рэпэртуару для беларускіх тэатраў.

Тэатр, мастацтва і музыка.

Бел. Дзярж. Кіно прыняло да пастаноўкі лібрэта для вялікага кінофільму з жыцьця Заходняй Беларусі — „Атаман Муха“ — А. Вольнага.

— У Менску ў гэтым годзе будзе адкрыта опэрная студыя. Будуць таксама адкрыты пры Менскім Дзяржаўным Тэхнікуме клясы народнае музыкі.

— Беларускі сцэнарысты Алесь Ляжкевіч піша для Белдзяржкіно новы сцэнарый па аповесьці Якуба Коласа для кіно-фільму—„На прасторах жыцьця“.

— Беларускім Дзяржаўным Музычным Тэхнікумам вядуцца падрыхтаваўчыя работы да пастаноўкі на беларускай мове новых опэр: „Голька“, „У даліне“ (рэвалюцыйная) і інш...

— Белдзяржкіно заказала Язэпу Дыле апрацаваць кіно-сцэнарый „З-пад ярма“, Алесю Ляжкевічу напісаць кіно сцэнарый „На пераломе“ і Цьвікевічу—„Кветкі з бур'яну“.

— Дзяржаўны Вандроўны Тэатр пад кіраўніцтвам Галубка, падрыхтаваў да пастаноўкі новую п'есу: „Таміла“, па раману француского пісьменьніка Дюшэна, у перапрацоўцы Алеся Ляжкевіча. Для п'есы падрыхтаваны спэцыяльныя вопраткі і дэкарацыі.

22 красавіка адбылася ўрачыстае сьвяткаваньне сотага паказу ў І Б. Д. Т. п'есы з гісторыі рэвалюцыйнага руху на Беларусі „Кастусь Каліноўскі“ і ўшанаваньне яе аўтара і пастаноўшчыка—Міровіча, якому Наркамасьветы БССР надала годнасьць заслужанага артысты рэспублікі.

Аўдыторыя, прысутная ў памяшчэньні тэатру, ахарактарызавала сьвята І Б. Д. Т., як перамогу нацыянальнай беларускай культуры.

Усячына.

У Латвіі.

У хуткім часе ў Латвіі маюць адбыцца выбары ў Сойм.

Выбарных сьпіскаў — 18, на адным з якіх фігуруюць цяперашнія соймавыя паслы польскай меншасьці ў Латвіі: Віпішэўскі і віцэ-міністар унутраных спраў пас. Вежбіцкі.

І гэта на такі малы лік палякоў у Латвіі свой віцэ-міністар унутраных спраў!

Што-ж мы, беларусы, павінны мець у Польшчы ў пароўнаньні з палякамі ў Латвіі?

Пацыфісты б'юцца за ССРР.

Як інфармуе прэса, на міжнародным кангрэсе пацыфістычнай (проці-ваеннай) моладзі ў Галяндыі нямецкі дэлегат выразіў жаль, што на кангрэс не дапушчана пацыфістычная моладзь з ССРР.

У часе далейшай нарады, паміж старонынікамі і праціўнікамі ўчасьця моладзі ССРР на кангрэсе дайшло да паважнай бойкі, якая была з трудом зьліквідавана.

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпішчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Сяляне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўняе ей існаваньне.

Рэдактар-Выдавец: М. Масьцерко.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.